Слова для Жыцця (171)

Аўтар: Рэдакцыя
07.10.2018 00:00



Папа Францішак

Стаўленне вучняў Езуса чалавечае, яно вельмі часта сустракаецца і ў хрысціянскіх супольнасцях усіх часоў, верагодна, і ў нас саміх. У духу добрай волі, нават з вялікай стараннасцю мы хацелі б захаваць аўтэнтычнасць пэўнага досведу, асабліва харызматычнага, баронячы заснавальніка або лідара ад ілжывых наступнікаў.

Але адначасова з гэтым з'яўляецца занепакоенасць з нагоды "канкурэнцыі", што нехта можа скрасці новых паслядоўнікаў. У выніку, мы не можам цаніць тое добрае, што робяць іншыя: ён не ў парадку, бо "не наш"…

Езус заклікае нас сёння не думаць катэгорыямі "сябар / вораг", "мы / яны", "уваходзіць у групу / па-за ёй", "маё / тваё", але ісці наперад і адкрыць сваё сэрца, каб быць у стане прызнаць Яго прысутнасць і дзеянне Бога нават у незвычайных і непрадказальных сітуацыях і ў людзях, якія не належаць да нашага асяроддзя. Ідэя заключаецца ў тым, каб звярнуць увагу больш на аўтэнтычнасць рэалізацыі дабра, прыгажосці і праўды, чым на імя і паходжанне тых, хто яго робіць. І замест таго, каб судзіць іншых, мы павінны праверыць сябе і "адрэзаць" бескампрамісна ўсё, што можа знеахвоціць слабога чалавека ў веры.

Фрагмент прамовы перад малітвай "Анёл Панскі" ў Ватыкане, 30.09.2018 †

Слова для Жыцця (171)

Аўтар: Рэдакцыя
07.10.2018 00:00



[redacted]ар